риска, творческому подходу к решению возникающих перед ними задач, развитию инновационного мышления.

**Список использованной литературы**

1. Батракова, Л.Г., Инновации в сфере образования: экономические аспекты / Л.Г. Батракова // Ярославский педагогический вестник – 2012. – № 4. – Том I (Гуманитарные науки). – С. 121–124.
2. Сахарова, М.А. Инновации в сфере образования / М.А. Сахарова // Научный электронный архив [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://econf.rae.ru/article/6460. – Дата доступа: 28.09.2020.

УДК 378

**УВАХОДНЫ КАНТРОЛЬ ВЕДАЎ ЯК СРОДАК ДЫЯГНОСТЫКІ І ІНСТУМЕНТ КАРЭКЦЫІ НАВУЧАЛЬНАГА ПРАЦЭСУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН)**

**С.В. Мяньчэня, старшы выкладчык**
*БДАТЎ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Анатацыя:* Артыкул прысвечаны выкарыстанню магчымасцей уваходнага кантроля ведаў ва ўмовах масавай адукацыі
*Abstract.* The article is devoted to the use of input control of knowledge in the context of mass education
*Ключавыя словы:* уваходны кантроль ведаў, методыка выкладання
*Keywords:* input knowledge control, teaching methods

**Увядзенне**

У сучасным грамадстве адбываюцца карэнныя змены ў сістэме вышэйшай адукацыі, якая пачынае насіць масавы характар, што ў пэўнай ступені адпавядае запыту грамадства і працадаўцаў. У сувязі з тым, што колькасныя змены, могуць выклікаць якасныя – масавая адукацыя азначае як розны ўзровень ведаў людзей, якія прэтэндуюць на атрыманне дыплома, розную ступень іх матывацыі да навучання, пры тым, што, трапіўшы ва аўдыторыю, яны знаходзяцца ў аднолькавых умовах. Адказам на масавую вышэйшую адукацыю стаў Балонскі працэс, да якога Рэспубліка Беларусь далучылася 14 мая 2015 г. Сутнасць дадзенага працэсу не толькі ў вызначэнні двух ступеней вышэйшай адукацыі і магчымасці адукацыйнай мабільнасці, але і ў пэўным размежаванні студэнтаў па ўзроўню падрыхтоўкі (праз крэдытна-модульную сістэму і заданні рознага ўзроўню). Калі першыя, знешнія праявы, былі ўспрыняты беларускай сістэмай вышэйшай адукацыі, то рэалізацыя другіх ва ўмовах паточна-групавой сістэмы не адбылася ў поўнай меры. Важным інстументам дыягностыкі падрыхтоўкі студэнтаў з’яўляецца ўваходны

кантроль ведаў, выкарыстанне якога ў сучасных умовах ці абмежавана, ці носіць фармальны характар.

## Асноўная частка

Уваходны кантроль ведаў прымяняецца для дыягностыкі ўзроўня падрыхтоўкі студэнтаў, выяўлення рэштквавых ведаў (у выпадку, калі дысцыпліна працягвае школьны прадмет). У выпадку з замежнай мовай уваходны кантроль дапамагае сфарміраваць групы ў адпаведнасці з моўнымі навыкамі. Гэтая мера працуе, бо, натуральна, што студэнт, які дрэнна валодае мовай, не можа прадуктыўна працаваць сярод тых, хто лепш падрыхтаваны. Арыентацыя выкладчыка на слабейшых, робіць вывучэнне дысцыпліны, у падобным фармаце, немэтазгодным для астатніх і дыскрэдытуе сістэму адукацыі ў цэлым.

Падобны падыход важны і пры вывучэнні гістарычных дысцыпліп у ВНУ тэхнічнага профіля. Складваецца ўражванне, што гуманітарныя дысцыпліны (у тым ліку і гістарычныя) не ўпісваюцца ў канцэпцыю практыкаарыентавай адукацыі, што, разам з пераходам на двухузроўневую ступень “бакалаўр-магістр”, вядзе да скарачэння колькасці гадзін, якія адводзяцца на іх вывучэнне. Адным з довадаў, які апраўдвае дадзены працэс – дубліраванне дысцыплін са школьнай праграмай. На наш погляд, мэта гістарычных дысцыплін у ВНУ гэта фарміраванне навыкаў аналіза сацыяльна-эканамічных і грамадска-палітычных працэсаў як мінулага, так і сучаснага, што з’яўляецца важным этапам у падрыхтоўцы спецыяліста і выхаванні грамадзяніна. Аднак аналіз падзей немагчымы без ведання фактaлогіі, якая закладваецца на школьным этапе, і калі падобныя рэштквавыя веды адсутнічаюць, перад выкладчыкам паўстае задача іх фарміравання.

Нават пры адсутнасці магчымасці рознаўзроўневых груп, уваходны кантроль ведаў дазваляе вырашыць шэраг задач:

1. выявіць сярэдні ўзровень ведаў, для разумення ступені падрыхтаванасці аўдыторыі. Пры гэтым праверка можа быць праведзена ананімна, што выступіць дадатковым стымулам для самастойнага адказа, без спісвання.

2. выявіць студэнтаў з лепшай падрыхтоўкай, пры працы з якімі можна будзе звярнуць увагу на дадатковыя заданні аналітычнага і творчага профілю; а таксама тых студэнтаў, чый узровень падрыхтоўкі ніжэйшы за сярэдні, якім могуць дапамагчы ў паспяховым засваенні матэрыяла і фарміраванні вызначаных кампетэнцый дадатковыя кансультацыі, ці пэўная літаратура.

3. вызначыць праблемныя тэмы, ці перыяды гісторыі, пры вывучэнні якіх трэба звярнуць больш увагі. Сучасная праграма па дысцыпліне “Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі” прадугледжвае 9 лекцый, астатні матэрыял выносіцца на самастойную працу. Карэкціроўка зместа лекцый, улічваючы шырокую фармуліроўку тэм, як

напрыклад “Дзяржаўныя фарміраванні на тэрыторыі Беларусі ў IX – XVIII стст.” не будзе з’яўляцца адыходам ад праграмы. Калі ж праблемная тэма выпадае на семінарскі занятак, ці кантралюемую самастойную працу, тут спатрэбяцца метадычныя рэкамендацыі і дадатковыя заданні ў выглядзе паведамленняў.

4. вызначыць праблемную сферу ў рэштковых ведах. Як паказвае вопыт, адной з галоўных праблем студэнтаў з’яўляецца дэперсаніфікацыя гісторыі – частка не здольна вылучыць нават 3 гістарычных дзеячаў Беларусі. Праз вывучэнне дзейнасці асоб фарміруюцца гістарычныя вобразы і адбываецца разуменне, тых працэсаў у якіх яны жылі. Уваходны кантроль ведаў дае магчымасць вызначыць той спіс асоб, на якіх трэба звярнуць увагу ў працэсе выкладання.

У залежнасці ад пастаўленых задач выкладчык можа звярнуцца да ананімнай ці персанальнай формы ўваходнага кантроля ведаў. Што ж датычыцца зместа кантроля, то тут, на наш погляд, з’яўляецца мэтазгодным выкарыстанне заданняў на разважанне. Так адно з пытанняў можа быць сфармуліравана наступным чынам: “Вызначце адметных асоб/адметныя падзеі з гісторыі Беларусі?”. Разгорнуты адказ на такія заданні дазваляе вызначыць аналітычныя здольнасці студэнта і яго ступень валодання факталогіяй. Выкарыстанне тэставых заданняў пры дадзеным тыпе кантроля не з’яўляецца эфектыўным.

**Заключэнне**

Усё сказанае вышэй адзначае, што ва ўмовах масавай адукацыі ў Беларусі дадатковая адказнасць кладзецца менавіта на выкладчыка. З дапамогай уваходнага кантроля ведаў ён можа павысіць эфектыўнасць сваёй працы – засваенне атрыманых ведаў і навыкаў студэнтамі. Гэтая праца патрабуе дадатковых намаганняў. Пры адсутнасці матывацыі з боку студэнтаў і падтрымкі адміністрацыі імкненне працаваць па шматузроўневай сістэме можа знікнуць.

Такім чынам, выкарыстанне ўсіх магчымасцей уваходнага кантроля ведаў дазваляе скарэктаваць працэс навучання і зрабіць яго больш эфектыўным.

УДК 37.026.04

# О НЕКОТОРЫХ АСПЕКТАХ ПРИМЕНЕНИЯ МУЛЬТИМЕДИА-ПРЕЗЕНТАЦИЙ В КОНТЕКСТЕ ПРЕПОДАВАНИЯ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫХ ДИСЦИПЛИН

**А.Ю. Опарин, старший преподаватель**
*БГАТУ, г. Минск, Республика Беларусь*

*Аннотация.* В статье речь идёт о негативных аспектах применения мультимедиа-презентаций, связанных с преподаванием социально-